# Іван Кандрацьеў: вяртанне праз 165 гадоў

Выдатны пісьменнік і перакладчык Іван Кандрацьеў нарадзіўся ў вёсцы Каловічы цяперашняга Вілейскага раёна, але працяглы час жыў у Вільні і Маскве. Яго імя стала шырока вядомым дзякуючы доктару культуралогіі, прафесару Аляксандру Смоліку, які правёў грунтоўнае навуковае даследаванне і падрыхтаваў манаграфію «Божы дар Івана Кандрацьева», пра што «КГ» пісала раней.

Нядаўна ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася імпрэза, прысвечаная яго 165-годдзю. Выступаючы на імпрэзе, А. Смолік распавёў, што навуковыя пошукі распачаў пасля азнаямлення з кнігай «Александръ Сергеевичь Пушкинъ, его жизнь, смерть и сочинения» ў рэдкім фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Аўтарам кнігі быў дагэтуль невядомы даследчыку І. Кандрацьеў. І пачалося – праца ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве ў Вільні, Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы ў Маскве...

На выстаўцы прадстаўлены прыжыццёвыя выданні Івана Кузьміча (Казіміравіча), навуковыя працы, прысвечаныя даследаванню творчай спадчыны літаратара, а таксама выданні з асабістай бібліятэкі А. Смоліка.

Трэба адзначыць, што літаратурная спадчына І. Кандрацьева і сапраўды ўражвае: ён напісаў мастацкія творы на гістарычныя тэмы, падрыхтаваў гістарычны даведнік і вялікі гістарычны нарыс, з'яўляецца аўтарам такіх знакамітых песняў, як «По диким степям Забайкалья», «Очаровательные глазки» і іншых.

Таксама І. Кандрацьеў зрабіў вельмі якасныя пераклады вершаў Дж. Байрана, І.В. Гётэ, Ф. Петраркі і іншых славутых еўрапейскіх пісьменнікаў на рускую мову. На жаль, займацца літаратурнай працай на беларускай мове на тыя часы не было магчымасці: беларускае слова фактычна было выключана з дзяржаўнага і грамадскага ўжытку.

Акрамя літаратурнай творчасці, І. Кандрацьеў спрабуе сябе на тэатральных падмостках: жывучы ў Вільні, спачатку грае ў вандроўных тэатральных трупах, а затым ў Віленскім тэатры, які заснаваў знакаміты артыст Санкт-Пецярбургскага Александрынскага тэатра П. Васільеў.

Як адзначае прафесар А. Смолік у манаграфіі, *«...пісьменнік надаваў выключнае значэнне вуснай паэтычнай народнай творчасці, успрымаючы яе як крыніцу нацыянальнай культуры. У тэкст апавяданняў, аповесцяў, раманаў, твораў для дзяцей пісьменнік уводзіць мноства загадак, прымавак, прыказак і іншых твораў афарыстычнай малой прозы, у якіх адлюстроўваецца багацце вуснай народнай творчасці».*

Сёння творчасць І. Кандрацьева ўвайшла ў актыўны даследчы кантэкст беларускіх навукоўцаў: у маі 2013 года ў Вілейцы прайшлі Першыя Кандрацьеўскія чытанні, на якіх прадстаўленыя даклады беларускіх гісторыкаў, культуролагаў, філолагаў, краязнаўцаў. Плануецца чытанні праводзіць раз на два гады: у 2015 годзе яны пройдуць у Маскве пры падтрымцы Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Таксама падрыхтаваны праект памятнага знака на радзіме пісьменніка – у вёсцы Каловічы, дзе з'явілася на свет такая цікавая і шматгранная постаць, творчаць якой неабходна дасканала вывучыць і ўшанаваць.

*Павел САПОЦЬКА,*
*фота аўтара*



*А. Смолік*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ